## Подых пракаветнага жраца

Пайшло гэта з Літвы. Упершыню такое арганізаваў у 1987 г. археолаг **Адомас Бутрымас**, які ў 1980-я гады вёў археалагічныя раскопкі ў Варнаўскім рэгіянальным парку.

Гэтая мясціна знакамітая тым, што тут знайшлі больш за сорак паселішчаў з мезаліту і неаліту (4-7 тысячы гадоў).

Адсюль вядомая ўнікальная магіла жраца на гары Донкальніс (Хлебная гара), якая ў часы мезаліту была выспай пасярод возера. Жрэц быў пахаваны побач з крушняй камянёў, якая была пасыпаная чырвонай вохрай, што сімвалізавала нязгасны агонь. Цела і галава жраца былі ўпрыгожаныя караламі з прасвідраваных іклаў лася, дзіка і тура.

Дакрануўшыся рукамі да старой даўніны і увабраўшы той дух, Бутрымас надумаў запрасіць навакольных жыхароў, разысціся па навакольных горах і запаліць вогнішчы. Бачна было за 30 кіламетраў. Зрэшты, яшчэ ў канцы замінулага стагоддзя купальскія вогнішчы моладзь запальвала на пагорках пры сваіх вёсках, а агні было бачна далёка-далёка.

## Абвяшчэнне Дня адзінства балтаў

18 мая 2000 г. парламенты Літвы і Латвіі прызналі дзень 22 верасня — Днём адзінства балтаў.

Гістарычная падстава – 22 верасня 1236 года ў “Бітве пры Саўле” сумесныя сілы балцкіх плямёнаў разбілі войска мечаносцаў – носьбітаў гвалтоўнай хрысціянізацыі, дзейнасць якіх канчаткова была спыненая толькі Грунвальдам.

Калі б іх бліжэйшыя да мора супляменнікі так не супрацiўляліся нападнікам, так моцна не актывізавалася





б і племя літоўцаў, даўнейшая тэрыторыя якіх сёння падзеленая напалову беларуска-літоўскай дзяржаўнай мяжой. Да Літвы (яшчэ той, пачатковай, балцкамоўнай) уцякаў хто крапчэйшы з прусаў, куршаў, зямгалаў. Без іх Літва не паўстала б такой моцнай, а значыць – і не рушыла б і на ўсход, на цяперашнія беларускія землі, уключаць у сваю дзяржаву тэрыторыі, дзе на той час яшчэ адносна нядаўна таксама размаўлялі па-балцку (дзяды вядомых нам літоўскіх князёў яшчэ, відаць, памяталі і ўнукам пераказвалі).

Свой сімвалізм ёсць і ў тым, хто быў ініцыятарам прыняцця такога рашэння. Ініцыятыву падаў літоўскі дэпутат **Рымантас Смятона**, які ў літоўскім Сейме тады ўзначальваў групу па сувязях з Латвійскай Рэспублікай. Гэты Смятона – пляменнік першага (а пазней і апошняга) прэзідэнта даваеннай Літвы, нацыянальнага дыктатара Антанаса Смятоны. Да вайны той узначальваў “Саюза таўцінінкаў (нацыяналістаў)”, а ў 1990-м яго пляменнік Рымантас стаў на чале гэтай адноўленай арганізацыі.

З таго часу штогод 22 верасня старшыні парламентаў Літвы і Латвіі бяруць удзел ва ўрачыстасцях з нагоды Дня адзінства балтаў. Мерапрыемствы адбываюцца ў розных гарадах Літвы і Латвіі.

## Акцыя “Перагук агнёў”

У 2005 г. актывісты з шаўлеўскага клуба “Аўкурас” (Ахвярнік), які ўзначальвае **Дарус Раманчоніс**, злучылі зацверджаную парламентам прапанову з колішняй ініцыятывай Бутрымаса.На трох гарадзішчах Жамойцкага ўзвышша яны запалілі вялікія вогнішчы. Акцэнтуючы, што гэта не толькі Дзень адзінства балтаў, але яшчэ і свята восеньскага раўнадзення, калі дзень з ноччу роўны і пачынаецца цямнейшае паўгоддзе.

На наступны год да акцыі, названай “Перагук агнёў”, шаўлеўцы запрасілі далучацца больш супольнасцяў з Літвы і Латвіі. Ініцыятыва знайшла шырокі водгук. У 2013 г. вогнішчы палалі ўжо на 100 гарадзішчах і пагорках.У 2015-м колькасць мясцінаў наблізілася да 200. Агні палаюць у канкрэтны час, паміж 8-й і 9-й вечара.

Запальваюць вогнішчы таксама ў Польшчы (паўночны ўсход, дзе жылі прусы), у нас у Беларусі і нават на захадзе цяперашняй Расіі.

## Ахвярны козлік

Пачынаючы з 1999-га, у Вільні на берагах Вяллі на восеньскае раўнадзенне штогод у вечаровых прыцемках спальваюць вялізныя саламяныя інсталяцыі.

З 2003-га інсталяцыі з трыснягу, усталяваныя на вадзе, на Дзень адзінства балтаў спальваюць у затоцы на Куршскай касе. Робяць і постаці, і знакі з арнаментаў – адной сюжэтнай тэмы няма.

А пачыналася ўсё з таго, што ў 1992 г. фалькларысты разам са скульптарамі зрабілі **саламянага козліка** і ўрачыста яго спалілі на Туравай гары ў Вільні. Спалілі менавіта на восеньскае раўнадзенне, каб за ўраджай аддзячыць па-даўняму – ахвяраваўшы козліка (пра такія ахвяраванні ёсць згадкі ў фальклоры і хроніках), толькі што сімвалічнага, з саломы. Потым гэта штогод паўтаралі, ажно пакуль гэта не перарасло ў фестываль спальвання саламяных скульптур на Вяллі.





### Іх голас павінен быць чутны

Беларусы бяруць удзел у святкаванні Дня адзінства балтаў. Але ці так ужо рупіць тая старавечная бітва пры Саўле?

Можна тымі ці іншымі сцежкамі прывязаць яе да нас, выбудоўваць лагічныя ланцужкі, згадваць узнікненне Літвы і пашырэнне яе ўплываў на ўсход. Але важней іншае.

Гэта сапраўдная вогненная містэрыя, калі для кожнага ўдзельніка агонь, у які ён узіраецца, дае намошчваць сувязь – як вертыкальную, паміж пакаленнямі, так і гарызантальную, паміж людзьмі ў адзін момант на такім вялікім абшары, ад Цвяры да Сувалкаў.

Да сёння археолагі, гісторыкі і лінгвісты не прыйшлі да аднаго меркавання што да ўдзелу балтаў у фармаванні цяперашніх беларусаў. Адны абмяжоўваюць 20-30 працэнтамі, іншыя даводзяць, што масавага прыходу славянаў не было ўвогуле. Але для ўдзельнікаў Дня адзінства балтаў найперш важна тое, што балты – нашы найстаражытныя продкі, голас якіх павінен быць чутны.



**Інфармацыйная падтрымка:**

svajksta
www.svajksta.by

www.ragna.by

Каардынацыя ў Беларусі: svajksta@gmail.com
Каардынацыя на ўсходніх землях: tverzha@gmail.com
Каардынацыя ў Літве: baltai@aukuras.lt
Каардынацыя ў Латвіі: saulegunta@gmail.com



# Дзень адзінства балтаў

Штогод 22 верасня,
на восеньскае раўнадзенне,
ад 8-й да 9-й гадзіны вечара

на пагорках, на гарадзішчах, ля курганоў
запальваюць вогнішчы,
святкуючы Дзень адзінства балтаў.

*Што гэта за такая традыцыя?*
*Які такі “Дзень адзінства балтаў”?*
*Чаму запальваюць вогнішчы?*
*Адкуль гэта пайшло і да чаго тут мы?*